# Знак радаводнай памяці

## Малая радзіма ў творчасці Генадзя Пашкова

**Малая радзіма для вядомага паэта Генадзя Пашкова – гэта і вечна юная Прыпяць, якая коціць салаўіную песню, і чысты блакіт, і рэчка Княгінька ля Заслаўя, якая ўся ў каменьчыках пырскае зорнай вадой, апавядаючы з-пад сівых тумаоў думу вешчых курганоў, і мілагучная мова беларусаў, багатая на дабрыню.**

Генадзь Пашкоў – з пакалення «сямідзясятнікаў». На ягоным творчым рахунку каля двух дзясяткаў зборнікаў вершаў, публіцыстыкі і кніг для дзяцей. Аўтар паэтычных зборнікаў «Кляновік» (1975), «Дыстанцыя небяспекі» (1979), «Красный жаворонок» (Масква, 1977), «Гравюры дарог» (1981), «Зямлю слухаю» (1983), «Маналог на кастрышчы» (1986), «Крокі» (1988), «Люблю, спадзяюся, жыву» (1990), «Журавінавы востраў» (1998), «Тваім святлом благаслаўлёны» (2006), «Маё лета» (2011); кніг мастацкіх нарысаў «Будзень як свята» (1977), «Палескія вандроўнікі» (1998); дзіцячых кніг «Дзяўчынка з блакітным мячыкам» (1986), «Пціч» (1992), «Зорнае поле» (1999) і інш.

Паэзія-берагіня адорвала яго цудатворным уменнем слухаць зямлю, з глыбінных нетраў якой нашэптвалася невытлумачальная любоў да гаючай празрыстай кроплі кляновіку, да гравюр дарог, медунічных вятроў, журавінавага вострава…

Зямное прыцяжэнне – бадай, адна з вызначальных катэгорый паэтавага мыслення, паэтавай споведзі. Думаецца, і сёння, калі ў творцы за плячыма ўжо 70, яму мроіцца той сіні палон пад жаўруковым званочкам, калі, зусім малечай, згубіўся ў сінім разліве заквітнелага лёну. Можа, быў у льняной сіняй кветцы-зорцы зямны, нейкі культавы магнетызм? Бо лён ды кужаль – існасць душы-апраткі беларуса-гаспадара, беларуса-вандроўніка. І ці не адтуль, з першага падарожжа – з калыхання блакітнага мора льняных кветак – і пачалося для паэта звабнае спасціжэнне зямнога паўшэпту, які чуецца яму ля Чашнікаў, дзе нарадзіўся, чуецца ля Смаргоні, дзе вырас, чуецца і на Палессі, дзе не адну сотню кіламетраў прайшоў на вёслах па Гарыні і Прыпяці.

І як трэба было па-сапраўднаму адчуваць жывое-роднае, каб так упэўнена, нават напорыста, праграмна сцвердзіць сваю жыццёвую заручонасць з «зямлёй маёй, зялёнаю расінкай»… Таму Пашкоў-паэт ужо колькі гадоў таму спавядальна, урачыста-святочна прызнаўся ў непарушнай знітаванасці з зямлёй-маці: «Зямля мая / зялёная расінка, / і чую я, / акрылены вясной, – / пчалой гудзе / світальная галінка / і пахне дзень / пралалінай вясной» («Зямля мая…»).

Схільнасць да лірычна-маляўнічага жывапісу, ахутаная асаблівай сыноўняй, грамадзянска-гаспадарскай заклапочанасцю лёсам зямлі – «зялёнай расінкі» – апазнавальны знак мастацкага почырку Генадзя Пашкова. Вялікая варажба словам напаўняецца шчырасцю і адкрытасцю душэўнага выяўлення, калі паэт вяртаецца да пачатку пачаткаў: да палескага гаркавага багуновага дурману, да салаўінай вёскі Войстам, адкуль паціху пазычае зёлкавыя словы. Вандроўная ду-

ша лірычнага героя, небам плыве ці шашою, ашчадліва захоўвае свае карані на бацькоўскай зямлі, у спёчна-малінавым куце, багатым на найлепшыя казкі і песні. Тут ён гатовы ўкленчыць «за той агеньчык ад бярэмца дроў, / за агурок храбусткі з агарода, за спеўных песень ціхую журбу» («Хата»), пакланіцца нізка хлебадару і салаўю.

Прага зямных першавытокаў – не аўтарская дэкарацыя, а найперш ягонае жыццёвае крэда, мадэль жыцця, сатканыя з зямной знітаванасці прыцягнення-вяртання да існага, прадонна неабдымнага і адвечнага радзімнага магнетызму. Зямля – пракаветны адухоўлены знак, знак радаводнай памяці ў паэтавым мысленні. Вобраз зямлі, трапяткі ў сваёй першароднасці, адметны неардынарным адчуваннем светласці жыцця, напоўнены свяшчэннай жыццядайнасцю. Гэты вобраз-мадэль увасабляе спадчынна-духоўны храм, у якім вястуе невынішчальны таямніча-плоцевы дух: «І з гэтай зямлёю / навекі заручаны я / сцяблінамі жытнімі, / найтрывалейшымі нервамі» («Сасна на выспе»).

Вызначальны вобраз паэтавага мыслення, паэтавай споведзі – вобраз зямлі. Спагадна і ўтульна адчувае ён сябе ў кожным куточку радзімай Беларусі. Тое ж Палессе палюбіў па-свойму, неяк вельмі ўжо асабіста. Гэты чароўны мацярык, як яго называе паэт, запаланіў душу непаўторнай прыгажосцю і той багатай і асабліва дарагой для беларускай нацыі гісторыяй, якая і сёння быццам шуміць у вершалінах магутных асілкаў-дубоў на берагах Прыпяці: «Мая любоў / і лёс мой / Прыпяць, / калыска песень і дуброў» («Прыпяць»).

Генадзь Пашкоў эмацыянальна глыбока і шматгранна ўвасобіў у паэтычным каларыце зямлі і матчыну далонь, і зялёную расінку, і сіняе святло васілька, і лісцвяныя завеі, і подых ветру, і золата зыркіх прысад, і сябе – як атожылка. У пэўным сэнсе вобраз Зямлі знаходзіць індывідуальна-аўтарскае вырашэнне, нясе ў сабе вялікі сэнс абагульнення, бо, на думку творцы, «кветкі на Зямлі / і ёсць / параненыя душы / чалавечыя» («Палаючая кветка»). Неспазнавальная найвялікшая тайна Зямлі, боль за кожную яе тканку – лейтматыў усіх паэтычных кніг Генадзя Пашкова. Ведучы маналог пра вечнасць Зямлі, творца спасцігае сваю радаслоўную: свой род, народ, ганарыцца якімі мае годнае права. «Мой род – народ вялікі», – гучна і нават урачыста скажа паэт.



◀ Генадзь Пашкоў

Любоў да роднай зямлі, жаданне глыбей спазнаць свой край – першааснова для Генадзя Пашкова. Тры гады запар у час водпуску вандраваў ён з сябраміаднадумцамі па цудоўным палескім краі – вынікам гэтых падарожжаў стаў лірычна-дакументальны дзённік «Палескія вандроўнікі». У аснову кнігі пакладзены ўражанні ад плавання на вёслах па Прыпяці і Гарыні. Самі ж падарожнікі назвалі свой маршрут «Дарогай Караткевіча». Бо задума падарожжа па Прыпяцкім Палессі даўжынёй у тры леты нарадзілася спакваля пасля згадкі суседа Г. Пашкова на лысагорскім лецішчы пра трывалы і адметны плыт, на якім калісьці вандраваў сам Уладзімір Караткевіч. Таму вандроўка «прыпяцкіх рабінзонаў» сталася своеасаблівым працягам апошняга падарожжа пісьменніка, якое трагічна перарвалася ў Лунінецкім раёне, дзе рачулка Смердзь упадае ў Прыпяць.

Генадзь Пашкоў старанна занатаваў усё пабачанае падчас трох памятных падарожжаў па «самай лепшай» зямлі, што знайшло адлюстраванне ў трох раздзелах кнігі – адпаведна «Прыпяцкая неруш. Падарожжа першае», «Вяртанне. Падарожжа другое», «Святло Прыгарыння. Падарожжа трэцяе». Гэта своеасаблівы зачын-аповед пра непаўторную маляўнічую палескую прыроду: «Асветлены месяцам, у затоках пачаў збірацца туман. У небе ажно кіпеў зорны павой. Глядзім у асветленае касмічнае бязмежжа, пачуваючы сябе вольнымі дзецьмі загадкавага Сусвету. Кожны думае пра сваё. А думкі чыстыя, светлыя, азораныя вечнымі, недасягальнымі свяцціламі. Гэта высокае святло – таемнае, загадкавае і недасяжнае». І далей: «Усё ажыло, заіскрылася, загаманіла. Атрасаючы сон, зашапацела дуброва. А ў пошуме яе нешта глыбіннае, вешчае, як стагоддзі сівыя прамаўляюць над няспыннаю плынню часу. І гэткае ж вешчае бачу ў несупынным ходзе ракі. Цячэ, як учора, як год, як стагоддзе, як тысячу гадоў таму. І вялікая радасць, і вялікі сэнс, і вялікая загадка ў несупынным руху».

Гэта была не проста дарога ў Прыроду, а найперш дарога да чалавечых сэрцаў. «Гляджу ў задуменную сінь акон маўклівых сялянскіх хат. Колькі гэтыя хаты пабачылі болю, перагаварылі разам з гаспадарамі! Запісаць бы ўсё, што пабачылі, перажылі людзі, атрымалася б самая праўдзівая гісторыя нашай зямлі, народа», – шчыруе Генадзь Пашкоў, расчулены адчайнай споведдзю тутэйшых людзей. Гэта няпросты, шматвектарны дыялог з сабою («Я – Я»), з тутэйшым насельніцтвам («Я – Вы»), з Сусветам («Я – Свет») пра людзей багатага лёсу, адкуль чэрпаў пісьменнік сілу і веру. Веру ў тое, што для іх – хлебадараў – будуць благаславёнымі тыя чатыры стыхіі, якія нараджаюць хлеб, – сонца, вада, зямля і агонь.

У «Палескіх вандроўніках» «галоўнае дзіва» – гэта людзі. Найперш звычайныя вяскоўцы-сяляне, рыбакі, паромшчыкі, якія апавядалі пра гісторыю, паходжанне назваў тамтэйшых мясцін, а таксама пра сябе, свае нягоды і не такое ўжо і зайздроснае, адвяяванае пад сонцам месца працаўніка. «Які ў нас дзіўны народ! Вынослівы! Двухжыльны! Крывавая гісторыя прайшлася па яго лёсе, апалілі пажары, а ён не ачарсцвеў, не азлобіўся, захаваў чыстую цнатлівую душу. Ён і сёння ў нешта верыць, знаходзіць апраўданне перажытаму». То людзі-дыяменты палескай зямлі (галасістая Марыя Лешчанка з вёскі Перароў, спакутаваная цётка Рома, Рома Юльянаўна Лігорская са Славінска, майстравітая Паўліна Мікалаеўна Жураўлевіч з Брынёва і інш.). Далятаюць галасы маладосці дзяцей «ворагаў народа», іх пакручастага лёсу, па якім так несправядліва прайшлася гісторыя. «Ці ж не з лёсаў такіх простых, можа, у жыцці малапрыкметных людзей вымалёўваецца абагульнены вобраз беларускай жанчыны, маці», – падсумоўвае сваё заключэнне ў верагоднай мадэлі «Жанчына – Зямля – Радзіма» Генадзь Пашкоў. Прыходзіць да такой высновы не толькі як пісьменнік-публіцыст, а як чалавек неабыякавы, з грамадзянскай пазіцыяй.

Перад чытачом паўстае абагульнены вобраз беларускай жанчыны-маці, самай паказальнай граматай якой служаць яе натруджаныя рукі, зробленыя палачкі на сцяне і захаваная чыстая цнатлівая душа. Як пачуваюцца гэтыя малапрыкметныя ў жыцці людзі праз віхуру імклівых гадоў, пасля беспакаранага разрабавання, ці ацалее сёння зберажоная продкамі спадчынная брама скарбаў – набалелы роздум Пашкова-публіцыста. Праз дыялогавую мадэль «Я – Свет» аўтар пакідае цэлы шэраг рытарычных пытанняў: «Слухаю цётку Рому, а сам думаю пра іншае: ці захаваюць наступнікі духоўны скарб продкаў? Ці зберагуць пад ашалелым напорам размывання, знішчэння, утоптвання ў гразь усяго, на чым спакон веку трымаўся народ? Ці выстаяць перад нахабнай пошасцю, што пад дэмагагічны гвалт аб новым мысленні, так званым прыярытэце агульначалавечых каштоўнасцей лезе гідкімі прусакамі з усіх шчылін?

Хіба ж працавітасць, мудрасць, дабрыня і чысціня нашага народа – не тыя

якасці, якімі магла б ганарыцца кожная нацыя, любы народ?». І далей дыялог са Светам пра набалела-роспачнае мае свой дакументальны працяг: «Пазней мне трапіла кніга гісторыка А. Лакоткі „Беларускае народнае дойлідства“. Багатая, глыбінная ў нас духоўная спадчына. І як мы дажыліся да таго, што неацэнны скарб продкаў занядбаны або ў лепшым выпадку пыліцца ў музейных запасніках? Няўжо не асілім глухату і абыякавасць да роднага, кроўнага?». Відавочна, пастаўленыя дваццаць гадоў таму пытанні актуальнымі застаюцца і сёння.

Жыццёвая філасофія палешукоў раскашуе і ў дыванах майстрых з вёскі Галубіца, што на Петрыкаўшчыне, і ў Столінскім старадаўнім парку, і ў маляўнічых абдымках палескай прыроды. Сам жа Генадзь Пашкоў як аўтар-дакументаліст, дасведчаны пра Беларускае і Літоўскае Палессе з самабытнай «Жывапіснай Расіі», уражаны адчутай спеўнай калыскай прыпяцкіх дуброў і крутым норавам, неўтаймоўнай плынню Гарыні, спавядальна шчыруе: «Вольна ісці лугавою дарогай насустрач цёпламу ветру. Нібы на крылах ляціш, услед за буслам. Так і хочацца заспяваць на ўсё горла, як спяваюць лугавыя насельнікі, кожны сваім голасам – адзін свішча, другі крумкае, трэці клякоча. І ўсё гэта плыве з азярыны, з чароту, з крушынавага куста, з высокай буслянкі, зліваецца ў адну дзіўную мелодыю. Ці ж не сімфонія жыцця? І так было тут адвеку і, хочацца спадзявацца, будзе заўсёды, пакуль свеціць над галавой высокае свяціла. Пакуль з глыбокіх зямных крыніц нясуць жывільныя воды рэкі». І далей – камунікатыўны ход падзякі: «Дзякуй табе, Палессе, за ўсё, што паказала і што падказала. Дзякуй за прыпяцкія плёсы, за спеўную калыску водарнага Прыгарыння. Дзякуй за людзей, з якімі звяла і пазнаёміла... Пульсуйце ж, жыватворныя крыніцы, цячыце, злівайцеся вірамі, плыткія палескія рэкі. Каб вечнай была беларуская зямля, каб любоў да яе напаўняла сэрцы... Адчуй зямлю гэту кожнай тканкай, спасцігні хараство і шчадротнасць яе, зліся з песнямі яе, з яе непаўторнай прыродай, каб жыць суладна, дыхаць адным дыханнем».








Вялікі сэнс і вялікую загадку нясе хараство палескай адысеі. Душа лірычнага героя акрыляецца не ад экзатычнай маляўнічасці, а менавіта ад нерушнасці пабачаных краявідаў: «Што анёлава калыска, / Дзе аглух / савіны крык, / У дубах павіснуў / нізка / Срэбрачысты маладзік» («На Гарыні…»).

Сапраўды, вабная дарожная дзея – гэта жыццё ў іншым вымярэнні. У «Палескіх вандроўніках» аўтар адначасова і лірык, і публіцыст-дакументаліст, чым і абумоўлены жанр твора. Дарагая для беларускай нацыі гісторыя, рамантычная паэтызацыя паляшуцкага жыцця, ягоная праўдзівая легендарнасць і таямнічадзівосная загадкавасць; усёпаглынальная любоў да ўсяго жывога, да спадчыны, што дасталася ад дзядоў і бацькоў; элегія жураўлінай пары перарастаюць у Генадзя Пашкова ў тэму малой радзімы з яе «шчасцем світальных дарог». Бо, кажучы словамі паэта: «Што мне сытае шчасце?! / Ёсць шчасце світальных дарог» («Жураўліная пара»).

Палеская зямля – пракаветны адухоўлены знак, знак радаводнай памяці, спадчынна-духоўны храм у паэтавым мысленні. Гэта якраз тое, што гаючы бальзам на душу кожнага, хто даражыць Бацькаўшчынай і для каго няма на свеце і быць не можа лепшай зямлі.

**Аліна САБУЦЬ, кандыдат філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі**